## Сёння

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.59 | 17.46 | 10.47 |
| Віцебск — | 6.51 | 17.34 | 10.43 |
| Магілёў — | 6.49 | 17.36 | 10.47 |
| Гомель — | 6.44 | 17.35 | 10.51 |
| Гродна — | 7.14 | 18.01 | 10.47 |
| Брэст — | 7.13 | 18.04 | 10.51 |

**Месяц**

*Поўня 4 сакавіка.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

**Імяніны**

**Пр.** *Данілы, Ілы, Паўла, Самуіла, Юльяна.*
**К.** *Альбіны, Антаніны, Феліксa.*

## Надвор'е на заўтра




Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА | +6 — +8 °С | Без ападкаў |
| ВІЛЬНЮС | 0 — +2 °С | |
| КІЕЎ | +3 — +5 °С | Без ападкаў |
| МАСКВА | -1 — +1 °С | |
| РЫГА | 0 — +2 °С | Без ападкаў |
| С-ПЕЦЯРБУРГ | -1 — +1 °С | |

## Дзве даты — 1 сакавіка



**1966 год** — савецкая аўтаматычная міжпланетная станцыя «Венера-3» дасягнула Венеры і даставіла на яе паверхню вымпел. Так была пракладзена першая міжпланетная траса і даказана магчымасць дасягнення планет Сонечнай сістэмы.

**1943 год** — СССР афіцыйна заявіў, што не мае намеру пасля вайны вяртаць Польшчы землі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

**Цытата дня:**

***«Жыццё — гэта нейкі своеасаблівы жарт, не трэба ўспрымаць яго ўсур'ёз. Сур'ёзных адносінаў да сябе заслугоўвае толькі мастацтва, а ўсё астатняе трэба ўспрымаць іранічна».***

**Джон Фаўлз (1926—2005), англійскі празаік.**

Дзённік Вікі Ц.

# Тэндар на гендар



**Апошнім часам зноў стала модна весці дзённікі. Інтэлігентныя дзяўчаты нагледзеліся прыгод Брыджэт Джонс і Каці Пушкаровай — і давай закупляць хто альбомы з коцікамі, хто салідныя тоўстыя сшыткі ў скуранай вокладцы, ды запісваць туды варыяцыі на вечныя тэмы. Віртуальнымі дзённікамі ў сусветным павуцінні захапіліся нават знакамітасці — ад Ганны Курнікавай да Яны Чурыкавай...**

**Ну і я не горш. Амбіцый у мяне — як у зорак, інтэлігентнасці як у тургенеўскіх паненак, аптымізму — як у Брыджэт Джонс. З першага ліста... З першага чысла... З першага вясенняга месяца... І пачну.**

*1.03.2007*

Самыя цяжкія выпрабаванні чамусьці застаюцца на канец зімы. Лютаўскія завеі і маразы. Эпідэмія грыпу. І чарада святаў.

Спачатку ты адчуваеш сябе не зусім нармальным, калі высвятляецца, што на двары 14 лютага, а ты без пары. Ну і падумаеш, адзін дзень можна ў горад не выходзіць, дома паесці, тэлевізар выключыць, каб не бачыць тэматычных канцэртаў і рамантычных камедый.

Але потым прыходзіць 23 лютага, за якім у перспектыве маячыць 8 Сакавіка, і тут ужо не адвярцецца. Жанчыны скупляюць адэкалон, бялізну, усякія незразумелыя прыбамбасы для машын. Мужчыны палююць на кветкі, цукеркі і ўпрыгажэнні. Але больш за ўсё дастаецца двум катэгорыям — артыстам і журналістам.

Не, я не тое каб ныю і скарджуся на жыццё. Хоць як тут на яго не скардзіцца? Надыходзіць 23 лютага, і адусюль — з блакітных экранаў, з дынамікаў радыё, з палосаў газет — глядзяць, спяваюць і віншуюць адны і тыя ж персанажы, з аднымі і тымі ж словамі. І што ты пра іх падумаеш добрага, калі палова не служылі, а туды ж — у святочны канцэрт? Прычым і на канцэрт 8 Сакавіка ідуць тым жа складам, у тых жа касцюмах і з тым жа зваротам на вуснах: «Дарагія нашы!». Артыстам, натуральна, можна паспачуваць: пяты год запар выказваць, стараючыся не збіцца і не паўтарацца надта часта, дзесяткі «найлепшых пажаданняў чытачам найлепшай газеты» — тут воўкам завыеш. А нам? Мы ж пра гэта пішы, здымай, расказвай.

Ну і расказваем. Ар-рыгінальна. Да 23 лютага — абавязкова пра ваеннаслужачага, да 8 Сакавіка — пра шматдзетную маці. Ой, і яшчэ пра тых жа артыстаў. Гэта ж усім жах як цікава — які памер гімнасцёркі насіў Уладзімір Ухцінскі, і якія самыя экзатычныя кветкі ў сваім жыцці атрымлівала да 8 Сакавіка Паліна Смолава... Усё, далей фантазія звычайна выключаецца. А калі не выключаецца, дабіваем самі: то захлынаемся ў кампліментах, то пачынаем сумнявацца ў мэтазгоднасці абодвух святаў, збіраем каментарыі прыхільнікаў і праціўнікаў, малюем карыкатуры, робім фотападставы... Як быццам ад таго, у чый адрас прагучыць больш віншаванняў, свята стане больш пераканаўчым і сапраўдным. Няўжо нельга без пафасу, без штучнага глянцу? Няўжо трэба «прыцягваць за вушы» ідэі, каб выказаць добрыя словы адзін аднаму напрыканцы зімы (хто больш? Хто менш?) — і шчасліва забыцца на гэту неабходнасць да наступнага года?..

Распісалася тут. А мне яшчэ, між іншым, апытанне да 8 Сакавіка рабіць. З артыстамі — з кім жа яшчэ? Бо фантазія скончылася.

**Санаторно-курортное унитарное предприятие «Белагроздравница» БелАПС (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости»**

проводят открытый аукцион по продаже комплекса зданий, сооружений и оборудования филиала «Детский санаторий «Дружба» в районе поселка Городище Минского района (далее — объект). Продаже подлежат: административное здание (84,9 кв.м), лечебный корпус (304,9 кв.м), спальный корпус № 1 (207,9 кв.м), спальный корпус № 2 (409,0 кв.м), спальный корпус № 3 (214,1 кв.м), спальный корпус № 4 (143,0 кв.м), столовая (1956,2 кв.м), веранда 61,9, водолечебница (75,5 кв.м), склад (25,1 кв.м), котельная (500,9 кв.м), ангар (559,1 кв.м), гараж (312,2 кв.м), пристройка к гаражу (82,9 кв.м), артезианские скважины питьевой и минеральной воды, ограждения, емкости. Площадь земельного участка 10,73 га. Начальная цена 2200000000 рублей включая НДС.

Размер задатка составляет 5 % от начальной цены лота и перечисляется на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331 г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости». Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона. Договор купли-продажи заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона. Закрепление земельного участка за новым собственником будет произведено местной землеустроительной и геодезической службой. Покупатель объекта обязан выполнить следующие условия:

- переоформить акт землепользования;
- соорудить забор по границе земельного участка между покупателем и общежитием филиала «Детский санаторий «Дружба»;
- обеспечить жильцов общежития филиала «Детский санаторий «Дружба» жизненно необходимыми условиями проживания (отоплением, электроэнергией, водоснабжением и канализацией) на условиях договора между покупателем и УП «Белагроздравница» БелАПС.

Оплата за объект производится в соответствии с договором купли-продажи. Аукцион состоится 15 марта 2007 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14 марта 2007 г. до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

**Контактный телефон: (8-017) 227- 40- 22**

## Усміхнёмся!

Дошка аб'яў у інтэрнаце:

15 студзеня. Згублены праязны білет на студзень, вялікая просьба вярнуць. Аддзячу ў той жа дзень.

2 лютага. Дзякуй, мярзотнікі...

☺

**Муж прыходзіць дадому з працы. Жонка цалуе яго і запальвае 18 свечак на торце, якія стаяць на накрытым стале.**

**— У кагосьці сёння дзень нараджэння? — пытаецца муж.**

**— Так, любы, — адказвае жонка, — у майго футра. Сёння яно стала паўналетнім...**

☺

Менавіта Дзень абаронцаў Айчыны дазваляе найбольш канкрэтна скласці спісак тых, каго трэба павіншаваць з 8 Сакавіка.

☺

**Дзяўчына прыйшла да варажбіткі.**

**— Мяне кахаюць два хлопцы. Скажыце, каму з іх пашанцуе?**

**Варажбітка раскінула карты, потым уважліва паглядзела на дзяўчыну.**

**— Пашанцуе Ігару — ты выйдзеш замуж за Аляксандра.**

☺

Дзяржаўная Дума прымае законапраект аб абавязковым вяшчанні ў фармаце 16x9, каб твары ўсіх слуг народу ўмяшчаліся ў кадр.

БЕЛАРУСБАНК

УТВЕРЖДЕНО
Правлением АСБ «Беларусбанк»
28 февраля 2007 г.
Протокол № 20

**УСЛОВИЯ ВЫПУСКА, ОБРАЩЕНИЯ И ПОГАШЕНИЯ СБЕРЕГАТЕЛЬНЫХ СЕРТИФИКАТОВ НА ПРЕДЪЯВИТЕЛЯ АСБ «БЕЛАРУСБАНК»**

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – банк) выпускает сберегательный сертификат на предъявителя – ценную бумагу, удостоверяющую сумму вклада (депозита), внесенного в банк, и права вкладчика (физического лица – держателя сертификата, за исключением индивидуального предпринимателя – держателя сертификата) на получение по наступлении установленного срока суммы вклада (депозита) и процентов по нему в любом учреждении (отделении) банка.

Сберегательный сертификат (далее – сертификат) является документальным оформлением договора банковского вклада (депозита).

Минимальная сумма денежных средств, размещаемых во вклад (депозит), составляет 100 000 (Сто тысяч) рублей.

Банк выпускает срочные сертификаты, номинированные в белорусских рублях.

Владельцами сертификатов могут быть физические лица – резиденты и нерезиденты в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**1. Порядок внесения денежных средств во вклад (депозит)**

Вкладчик вносит денежные средства во вклад (депозит) по сертификату как в безналичном порядке, так и наличными денежными средствами.

**2. Порядок начисления процентов**

При начислении процентов по сертификату количество дней в месяце условно принимается за 30, а в году – за 360. В месяцах, имеющих 31 день, 31-е число в расчет не принимается за исключением случаев, когда 31-е число является датой внесения вклада (депозита), а в феврале остаток за последнее число повторяется столько раз, сколько дней не достает до 30.

Проценты по сертификату начисляются учреждениями банка за период со дня поступления денежных средств в банк (включительно) по день, предшествующий дню оплаты сертификата.

Проценты по сертификату выплачиваются при его предъявлении одновременно с оплатой сертификата по наступлении указанного на нем срока возврата вклада (депозита) или досрочном предъявлении сертификата к оплате.

**3. Обращение сертификата**

Владелец сертификата вправе передать права по сертификату другому физическому лицу. Для передачи прав, удостоверенных сертификатом на предъявителя, другому лицу достаточно вручения сертификата этому лицу.

**4. Порядок возврата денежных средств физическим лицам**

Сертификат может быть предъявлен к оплате в любой рабочий день, начиная с даты, указанной в сертификате как срок возврата вклада (депозита). При наступлении срока оплаты предъявителю сертификата выплачивается сумма вклада (депозита) и сумма дохода в виде процентов, начисленных на сумму вклада (депозита). Выдача части денежных средств не допускается.

Оплата и погашение сертификата осуществляется при его предъявлении в любом учреждении банка как в безналичном порядке, так и наличными средствами в соответствии с законодательством Республики Беларусь в зависимости от волеизъявления предъявителя сертификата.

В случае, если срок возврата вклада (депозита) по сертификату совпадает с выходным или праздничным днем, то оплата сертификата производится в первый рабочий день, следующий за ним.

Если срок получения средств по сертификату пропущен, то, начиная с обозначенного на нем срока возврата вклада (депозита), банк обязуется возвратить вклад по первому требованию владельца.

Проценты за период, начиная со срока возврата вклада, указанного на сертификате, до фактического предъявления его к оплате не начисляются.

**5. Досрочная оплата сберегательного сертификата**

До наступления срока возврата вклада (депозита) сертификат может быть предъявлен для досрочной оплаты в любое учреждение банка независимо от места его выдачи.

Учреждение банка производит досрочную оплату сертификата как правило в день его предъявления (но не позднее пяти банковских дней со дня предъявления требования предъявителем сертификата).

В случае досрочного предъявления сертификата к оплате, предъявителю сертификата выплачивается сумма вклада (депозита) и сумма процентов, причитающихся к выплате, исходя из размера процентной ставки, предусмотренной по вкладу «до востребования» в белорусских рублях (с учетом ее изменения) за период фактического срока хранения вклада (депозита).

**6. Ответственность банка за неисполнение обязательств**

В случае неисполнения своих обязательств банк обязуется уплатить вкладчику штраф в размере установленной законодательством одной базовой величины на день выплаты.

Выпуск сберегательных сертификатов на предъявителя в соответствии с настоящими Условиями АСБ «Беларусбанк» осуществляет с 12 марта 2007 года.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. Лицензия № 02200/0247727 на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам зарегистрирована в реестре лицензий Министерства финансов Республики Беларусь 29.01.2007 г. за № 5200-1246-901, срок действия — до 29.07.2007 г.*

У свеце жывёл

## ЯДАВІТЫЯ СУСЕДЗІ

Брастаўчанін Цімур Зінаў разводзіць у сваёй кватэры смяротна ядавітых павукоў. У яго кватэры сабрана самая вялікая ў краіне калекцыя павукоў-птушкаедаў. Павукамі Цімур займаецца ўжо больш як восем гадоў. На сарака квадратных метрах разам з ім, жонкай Любай і дачкой Лінай жыве каля 52-х відаў павукоў-птушкаедаў. Палова з падапечных смяротна ядавітыя. Знаходзяцца яны ў шкляных скрынях — тэрарыумах, накрытых зверху марляй. Штогод гаспадар частуе іх летам жабамі, а зімой — мышамі.




**На здымку: Цімур з павуком-птушкаедам «Lasiodora parahybana».**

# Крынічка

*«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарослая крынічка».*
Якуб КОЛАС.

*Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285–88–81*

№ 5 (223)

## Браколі — сястра цвятной капусты

**«Дачны вопыт у мяне невялікі, кожны год на агародзе высяваю новую культуру. Раскажыце пра браколі, яе адрозненне ад цвятной капусты». Н. Ліс, в. Зарэчнае.**



Нават па знешняму выгляду яны падобныя. Кветканосы браколі, у адрозненне ад кветканосаў цвятной капусты, больш раздзеленыя. Пасля таго, як галоўнае суквецце зрэзана, з пазух лісця вырастаюць шматлікія парасткі, кожны з якіх увенчаны невялікім суквеццем. Дзякуючы гэтаму перыяд збору ўраджаю прадаўжаецца.

Браколі вельмі смачная. У ёй значна больш вітамінаў і мінеральных соляў, чым у цвятной капусце. Патрабаванні да глебы, вільгаці і клімату такія ж, як і для цвятной капусты.

Асноўнае, на што не варта забываць: на працягу тэрміну вегетацыі браколі трэба тройчы падкарміць з разліку 5 г N на кв. м і 4—5 разоў шчодра паліць (20—25 л на 1 кв. м). Браколі не любіць цвёрдай, пакрытай скарынкай глебы, таму паміж радкамі патрэбна рэгулярна рыхліць. Вельмі карысна мульчыраванне глебы арганічнымі рэчывамі.

Пасадзіўшы браколі на пастаяннае месца ў пачатку мая, можна атрымаць ураджай у другой палове чэрвеня.

Суквецці зразайце, калі асобныя бутоны поўнасцю сфарміраваныя, але яшчэ шчыльна закрытыя.

Асабліва хутка раскрываюцца бутоны ў гарачае надвор'е, вось тут і будзьце ўважлівыя, не ўпусціце момант збору. Суквецці зразаюцца разам з мясістым сцяблом даўжынёй 10—15 см, якое таксама ідзе ў ежу. Хутка з пазух лісцяў вырастуць бакавыя сцёблы, кветканосы з якіх можна будзе зрэзаць праз 16—20 дзён. Калі, зрэзаўшы галоўнае суквецце, вы падкорміце расліну і не забудзецеся на рэгулярныя палівы, бакавыя суквецці будуць даволі вялікімі (хоць, вядома, меншымі, чым асноўнае). Браколі нельга захоўваць, бо далікатныя суквецці хутка вянуць. Затое гэту агародніну добра замарожваць. Зімой, калі вітамінаў мала, стравы з браколі вельмі дарэчы. Можа, вы звярнулі ўвагу: у нашых магазінах, пачынаючы з позняй восені і да канца зімы, у наборы замарожанай агародніны ёсць і браколі. Наборы гэтыя прывозяць да нас з-за мяжы, і яны даволі дарагія. Так што, купляючы зараз насенне, не забудзьцеся на браколі, а ўжо ў канцы сакавіка— пачатку красавіка можна высеяць на расаду, каб, прайшоўшы ўсе этапы вырошчвання, мець гэты вітамінны прадукт і ўлетку, і зімой на сваім стале.

## Планеты ў сакавіку

Меркурый пасля перыяду нябачнасці з'яўляецца на фоне ранішняй зары і да канца месяца аддаляецца ад Сонца на 26 градусаў.

Венера назіраецца ўвечары.

Марс бачны раніцай.

Юпітэр з'яўляецца пасля поўначы на ўсходзе ў сузор'і Скарпіёна.

Сатурн перамяшчаецца па сузор'і Льва.

**Праходжанне Месяца па знаках задыяка**

| Дні сакавіка | Знакі задыяка |
|---|---|
| 2 | Дзева |
| 5 | Шалі |
| 7 | Скарпіён |
| 10 | Стралец |
| 12 | Казярог |
| 15 | Вадалей |
| 17 | Рыбы |
| 19 | Авен |
| 21 | Цялец |
| 23 | Блізняты |
| 25 | Рак |
| 27 | Леў |
| 30 | Дзева |

**Фазы Месяца ў лютым**

| | |
|---|---|
| Поўня | 4—11 |
| Апошняя квадра | 12—18 |
| Маладзік | 19—24 |
| Першая квадра | 25 сакавіка— 1 красавіка |

## Агародныя падказкі

● Калі на ўчастак пад бульбу з восені было ўнесена многа арганічных угнаенняў, саджаюць клубні больш буйныя, а калі гною было ўнесена мала, лепш для пасадкі выкарыстоўваць клубні больш дробныя, але садзіць іх у радку часцей.

● Пасадзіце на ўчастку суніц садовых маргарыткі — калі лісце ў маргарыткі падвяне, суніцы час паліваць.

● Задзярненне глебы пад раслінамі вішні змяншае прырост, прыводзіць да адмірання верхняй часткі парасткаў, адмоўна ўздзейнічае на цвіценне і завязванне пладоў. Глебу пад вішнямі рэкамендуецца перакопваць кожную восень на глыбіню, каб не закранаць карані, а вясной і летам падтрымліваць у рыхлым стане, свабодным ад пустазелля.

## Сакавік не вясна, а прадвесне

Вы, відаць, пашкадавалі люты за тое, што яму прыйшлося адказваць перад прыродай за ўсе зімнія месяцы, што называецца, «аддувацца» за сваіх братоў-лайдакоў, хоць люты апраўдаў сваю назву. Дык вось, вельмі хочацца, каб сакавік апраўдваў назву веснавога месяца. Недарэмна ў народзе кажуць, што сакавік зіму заканчвае, а вясну пачынае. Але разам з тым нашы продкі папярэджвалі, што сакавік каварны: і плача, і смяецца, што мароз садзіцца толькі на нос, і што ён скрыпучы, ды не пякучы. Пра пару, калі зіма павінна саступіць месца вясне, у народзе гаварылі: «Люты вады падпусціць, а сакавік падбярэ». Але надта давярацца лагоднасці першага вясновага месяца было б неабачліва, паколькі зіма ў гэты час яшчэ не здавалася: «Марац кусае за палец», — гаварылі ў народзе. Яшчэ казалі, што калі ў сакавіку снежок задзьмуў на лес, то будзе ўраджай на агародзе, а калі аблокі плывуць хутка і высока — да добрага надвор'я.

Але тое, што заўсёды было ў сакавіку, гэта важная падзея прыроды — дзень з ноччу раўняецца.

## Сад на пачатку вясны

**Давайце заглянем у сакавіцкі сад, высветлім: чым мы можам дапамагчы дрэвам**

Хоць зіма ў гэтым годзе была няснежная, але і таму снегу, які яна нам падарыла, мы рады і павінны пастарацца затрымаць яго як мага даўжэй у садзе і на агародзе. Снег ушчыльняюць вакол кожнага дрэва, рабіць гэту працэдуру лепш у адлігу, тады снег добра ўтоптваецца, а калі пахаладае, ён хутка змерзнецца і мышы не змогуць пад ім перамяшчацца. Акрамя таго, ушчыльнены слой снегу перасцеражэ карані ад падмярзання. А з прыходам цяпла ён паволі растае і насычае зямлю вадой. Снег яшчэ можа быць, хоць і нячастым, але госцем у сакавіку, таму сачыце, каб ён не паламаў крону дрэў, стрэсваць яго можна пастукваннем палкай па галінках. Лёд таксама збіваюць палкай, а ўстаноўкай падпорак да сучкоў ці падвязкай іх да ствала можна папярэдзіць многія пашкоджанні.

У канцы зімы многія аматары-садаводы праводзяць абрэзку дрэў. Хоць, як сведчыць вопыт, абрэзка праводзіцца з кастрычніка па красавік. Адзіная ўмова: нельга абразаць дрэвы ў моцныя маразы. Мёрзлая драўніна вельмі крохкая, інструменты дрэнна рэжуць, раны горш зажыўляюцца, пашкоджваецца шмат пупышак і галінак.

**З дапамогай абрэзкі, у залежнасці ад узросту дрэў, можна дасягнуць найбольш аптымальных суадносінаў паміж вегетатыўнымі і генератыўнымі пладовымі ўтварэннямі, — гаворыць вядучы спецыяліст НДІ пладаводства Надзея Капічнікава.**

Пры правядзенні фарміруючай абрэзкі, напрыклад, **у грушы**, у першыя гады пасля пасадкі аднагадовыя галінкі пакарочваюца ад 1/5 да 1/2 даўжыні ў залежнасці ад сілы росту і асаблівасцяў гатунку. У сувязі са слабай марозаўстойлівасцю грушы магчыма паяўленне вялікай колькасці атожылкаў на ват у маладым узросце. Неперспектыўныя парасткі неабходна выразаць, а астатнія ператвараць у абрастаючыя ці выкарыстаць для замены тых, што загінулі. У перыяд поўнага плоданашэння пры добрым росце патрэбна рэгулюючая абрэзка, пры якой фарміруецца колькасць пунктаў росту за кошт выразання толькі буйных галін.

***(Працяг будзе.)***



# Месяцавы каляндар земляроба

| РАБОТЫ | СПРЫЯЛЬНЫ ЧАС |
|---|---|
| Пасадка і перасадка пакаёвых раслін, рыхленне глебы ў вазонах | з 5-га 11.26 па 10-га 12.38<br>з 17 7.31 па 18-га<br>з 21-га 7.16 па 23-га 8.07 26—27-га<br>з 30-га 6.28 |
| Апрацоўка пакаёвых раслін ад шкоднікаў і хвароб | з 8-га 0.18 па 12-га 22.36<br>з 15-га 4.53 па 17-га 7.31 |
| Пасеў аднагадовых на расаду: духмяны гарошак, ляўкой, флокс Друмонда, анцірынум, кальцэалярыя, духмяны табак | з 21-га 7.16 па 23-га 8.07<br>з 30-га 6.28 |
| Пасеў аднагадовых на расаду: калістэфус, аксаміткі, вербена, гацанія, гваздзікі кітайскія, калеус, лаватэра, сальвія, сальпіглосіс, лабелія, пенстэмон, петунія | з 25-га 12.50 па 27-га 20.05<br>з 30-га 6.28 |
| Пікіроўка расады кветак і гародніны | з 15-га 4.53 па 17-га 7.31<br>з 12-га 22.36 па 15-га 4.53 |
| Санітарная абрэзка кустоўя і жывой агароджы | з 5-га 11.26 па 8-га 0.18<br>з 12-га 22.36 па 19-га 7.43 |
| Нарыхтоўка адраўненых чаранкоў | з 23-га 8.07 па 27-га 20.05 |
| Пасеў белакачаннай і цвятной капусты для адкрытага грунту | з 21-га 7.16 па 23-га 8.07<br>з 25-га 12.50 па 27-га 20.05 |
| Пасеў каранёвага сельдэрэю | з 5-га 11.26 па 10-га 12.38<br>з 17-га 7.31 па 18-га |
| Пасеў цыбулі-парэю | з 19-га 7.43 па 21-га 7.16<br>з 23-га 8.07 па 27-га 20.05 |
| Прышчэпка пладовых дрэў | з 21-га 7.16 па 23-га 8.07<br>з 25-га 12.50 па 27-га 20.05 |
| Пасеў нізкарослых таматаў на расаду для адкрытага грунту | з 8-га 0.18 па 12-га 22.36<br>з 17-га 7.31 па 18-га<br>з 21-га 7.16 па 23-га 8.07<br>з 25-га 12.50 па 27-га 20.05 |
| Падкормка расады мінеральнымі ўдабрэннямі | з 21-га 7.16 па 23-га 8.07 |
| Падкормка цвітучых пакаёвых раслін слабым растворам поўнага мінеральнага ўдабрэння | з 25-га 12.50 па 27-га 20.05 |
| Падкормка расады арганічнымі ўгнаеннямі | з 5-га 11.26<br>з 8-га 0.18 па 10-га 12.38<br>з 12-га 22.36 па 15-га 4.53<br>з 17-га 7.31 па 18-га |
| Апырскванне пладовых дрэў і кустоўя ад шкоднікаў і хвароб | з 8-га 0.18 па 12-га 22.36<br>з 15-га 4.53 па 17-га 7.31 |
| Выкладка бульбы на прарошчванне | з 5-га 11.26 па 15-га 4.53<br>з 21-га 7.16 па 23-га 8.07<br>з 25-га 12.50 па 27-га 20.05 |
| Пасеў базіліку, маярану і іншых востраводарных траў на расаду | з 8-га 0.18 па 11-га<br>з 21-га 7.16 па 23-га 8.07 |

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 1177. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12